Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

Орган парткома і прафкома Бел. Дзярж. Універсітэта

№ 2(31) 13 студзеня 1937 г. № 2(31)

Сіла нашай агітацыі—
у праўдзівасці.
Сіла лозунгаў партыі—
у дзейственнасці
(З „Правды")

Аўладаем вялікім мастацтвам—большэвіцкай агітацыяй!

ПАЛЕПШЫЦЬ АГІТАЦЫЙНУЮ РАБОТУ

Ленін і Сталін заўсёды выключную ўвагу ўдзялялі агітацыі, рабоце з масамі. Асабліва цяпер, калі наша краіна прыняла новую, самую дэмакратычную у свеце Канстытуцыю пытанне агітацыйнай работы набыло асаблівае значэнне.

Таварыш **Сталін** у сваім дакладзе на Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездзе Саветаў указаў на неабходнасць паляпшэння агітацыі: «Калі народ койдзе і выбярэ варожых людзей, то гэта будзе азначаць, што наша агітацыйная работа пастаўлена з рук вон дрэнна, і мы ўпаўне заслужылі такую ганьбу, калі-ж наша агітацыйная работа будзе ісці па-большэвіцку, то народ не дапусціць варожых людзей у свае вышэйшыя органы. Значыцца, трэба працаваць, а не хныкаць».

У СССР канчаткова і беспаваротна перамог социялізм. Пабудована магутная, социялістычная дзяржава рабочых і сялян. Знішчаны эксплаататарскія класы. Але гэта не азначае, што ў нас ужо няма ворагаў. Яшчэ ёсць астаткі варожых класаў. Трацкісцка-зіноўеўскія паследышы прадаўжаюць яшчэ сваю здрадніцкую работу. А таму нам заспакайвацца нельга. Большэвіцкая пільнасць застаецца асноўным законам.

Агітацыю трэба умела арганізаваць і весці сістэматычна, штодзенна ўлічваючы ўзровень аудыторыі і цікавячыя слухачоў нытанні.

У пастанове ЦК ВКП(б) аб стаповішчы налітагітацыі на балахінскім камбінаце ясна ўказана, што нельга агітацыйную работу пускаць на самацёк, што неабходна стварыць моцны калектыў агітатараў з лепшых комуністаў і комсамольцаў. Работу агітатараў павінны ўзначальваць сакратары партыйных камітэтаў.

Гэта рашэнне ў нас ноўнасцю яшчэ не выканана. Агітатары прадастаўлены самі сабе, для іх няма высокаякаснай кансультацыі, няма планаў работы. Партгабінет зусім не кіруе агітатарамі. Друкуемыя сёння матэрыялы поўнасцю пацвярджаюць сказанае.

Так далей працягвацца не можа. Партыйны камітэт навінен перабудаваць агітацыйную работу.

Агітацыя — гэта вялікае мастацтва і мы навінны аўладаць ім, як гэтага патрабуе ад нас Сталінская Канстытуцыя.

Не праводзяцца палітгутаркі

Палітгутаркі ў **пакоі № 49**, дзе жывуць студэнты III курса фізмата, з'яўляюцца вельмі выпадковай з'явай. Апошняя гутарка адбывалася больш месяца таму назад. Агітатар накоя тав. Пантусевіч не думае аб сваіх абавязках.

Праўда, большасць студэнтаў рэгулярна чытаюць газеты, але ёсць шмат пытанняў, аб якіх трэба нагаварыць цэлым калектывам.

Трэба таварышу Пантусевічу ўспомніць пра свае абавязкі і ўзяцца за працу.

ЖЫХАР.

ЖЫВА і РАДАСНА

У пакоі № 8 палітгутаркі праводзяцца сістэматычна адзін раз у шасцідзенку. У час Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Саветаў і Надзвычайнага XII Усебеларускага З'езда Саветаў гутаркі праводзілі па два разы ў шасцідзенку.

За апошнія два месяцы мы абгаварылі даклад таварыша Сталіна аб праекце Канстытуцыі СССР і іншыя матэрыялы Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Саветаў. Жыва і радасна прайшлі гутаркі пры абгаварэнні Сталінскай Канстытуцыі. Больш за ўсё нас цікавілі главы аб грамадскім ладзе ў СССР і аб правах і абавязках грамадзян.

На палітгутарках у нас скарыстоўвецца геаграфічная карта, па якой мы вывучаем новае раёнаванне СССР. Кожны жыхар пакоя мае новую Канстытуцыю.

У палітгутарках актыўны ўдзел прымаюць жыхары нашага пакою **Вярцелка, Бабчонак, Фурманец, Кошкіна** і інш.

Трэба адзначыць, зацікаўленасць агітатарам **тав. Каган** сваёй работаи. Яна падбірае цікавы матэрыял, загадзя аб'яўляе нам калі і якая будзе праводзіцца гутарка, добрасумленна сама рыхтуецца да палітгутарак.

БЕРНШТЭЙН.

Сум і зевата у часе палітгутарак

У **пакоі № 43** агітатарам працуе таварыш **Ротман.** Ен хоць і рыхтуецца да палітгутарак, але праводзіць іх нецікава і сумна. Так і хочацца заснуць, што і робяць многія студэнты забіраючыся пад коўдру. У чым «сакрэт», што гутаркі праводзяцца сумна? Перш за ўсё ў тым, што адсутнічае ў яго план правядзення палітгутарак. Распрацоўваецца тое, што пападзецца пад рукі.

Студэнты таму не рыхтуюцца да гутаркі, амаль не прымаюць удзелу ў ёй. Зачыталі, праслухалі... па гэтым гутарка і канчаецца. Існуе паралелізм пры прапрацоўцы тэм. Зразумела, гэта вядзе да таго, што палітгурткі праводзяцца суха, фармальна.

Адказны член парткома за работу агітатараў тав. **Мільман** не дае ўказанняў, якія тэмы патрэбна абгаварваць. Няма плана работы агітатараў. Рэдка праводзяцца кансультацыі.

Некаторыя студэнты, як **Паўлоўскі** Янка, не толькі не дапамагаюць у рабоце агітатара, а наадварот, самі не слухаюць і другім перашкаджаюць.

Добра падабраная тэма зацікаўлівае ўсіх жыхароў пакою, так папрыклад, месяц таму назад праводзілася гутарка па артыкулу ў «Комсомольскай правде» — «Неравный брак». Кожны студэнт спяшаўся выказацца па закранутаму пытанню. Гутарка цягнулася да 2-х гадзін ночы з вялікай актыўнасцю.

Але з таго часу больш не праводзілася ні адна гутарка.

Студэнты хочуць, каб гутаркі праводзіліся па цікавых тэмах і падрыхтаванымі агітатарамі.

БОНДАРАУ.

Тры гутаркі за поўгода

У пакоі № 51 галоўнага корпуса агітатарам з'яўляецца **Цішчанка** Іван Грыгоравіч.

За прайшоўшае паўгодзе ён правёў 3 гутаркі: 1. артыкул таварыша Гікало — «Выпікі чысткі КП(б)Б», 2. «Гадавіна смерці Кірава», 3. «Неравный брак». Ажыўлепа і цікава прайшла толькі гутарка аб смерці таварыша Кірава. На астатніх 2-х гутарках не ўсе прысутнічалі і праведзены яны былі фармальна. Агітатар прачытаў і ўсё.

У сувязі з тым, што цяпер увага ўсіх працоўных прыкована да надзей у Іспаніі рашылі ў пакоі № 51 начаць вывучэнне геаграфіі Іспаніі, нават у комсамольскі камітэт паведамілі, што ўжо прыступілі да вывучэння, а ў сапраўднасці гэта пакуль-што толькі пажаданне.

Цішчанка хоць і мае нагрузкі (сакратар комсамольскай арганізацыі хімфака), але пры жаданні мог-бы лепш паставіць работу.

Жыхары пакоя вельмі цікавяцца бягучымі падзеямі: чытаюць газеты і кожны вечар пасылаецца «дэлегацыя» ў пакой № 13 слухаць апошнія паведамленні па радыё, якая потым расказвае аб пачутым усім жыхарам пакоя.

КАВАЛЕНКА, БАЛУХА, КАРПУЧОК.

ЛЕПШ СТАЛІ ПРАЦАВАЦЬ

Спачатку гэтага года палітгутаркі ў пакоі № 5 праводзіліся вяла, нецікава. Студэнты не ўдзельнічалі ў гутарках, а толькі слухалі агітатара.

Цяпер гэта становішча рэзка змянілася. Кожны студэнт рыхтуеппа да палітгутарак. У працэсе гутаркі паступае многа цікавых нытанняў і выступленняў.

За апошні час у нашым пакоі абгаварылі матэрыялы Надзвычайнага VIII Усесаюзнага З'езда Саветаў: даклад таварыша Сталіна, прамовы тт. Молатава, Літвінава, Галадзеда і інш.

Праведзена было дзве гутаркі аб падзеях у Іспаніі. Правялі гутарку-даклад аб жыцці і дзейнасці М. В. Ламаносава, а таксама аб усесаюзным перапісу. «Неровным браке» (артыкул з «Комсомольскай правды»).

Добра вывучылі Сталінскую Канстытуцыю і іншыя матэрыялы.

ДРАЗДОЎ.

Задаволены палітгуртком

Палітгурток, у якім займаюцца комсамольцы **III і IV курсаў біяфака** пад кіраўніцтвам таварыша **Кучара,** можа даць прыклад у сваёй рабоце другім палітгурткам.

Трэба адзначыць, што кіраўнік гуртка актыўна ўцягвае слухачоў у распрацоўку даклада таварыша Сталіна, грунтоўна застанаўліваючыся на кожным пункце. Часта ўзнікаюць спрэчныя пытанні, па якіх слухачы атрымліваюць з боку кіраўніка заўсёчы ноўны і вычарнальны адказ. Комсамольцы заўсёды задаволены палітзаняткамі. Прапагандыст добра падрыхтаваны і сур'ёзна адносіцца да заняткаў.

Комсамольцы надрыхтоўваюцца да заняткаў добра, выкарыстоўваюць рэкамендованую літаратуру. Таму заняткі праходзяць жыва, пры актыўным удзеле усіх слухачоў. Лепшыя слухачы палітгуртка тт. **Пыж, Пушны, Найман.** Але некаторым комсамольцам, як тт. Мільгуй, Пузеўская і інш., якія прышлі ў наш гурток не так даўно, патрэбна было-б рыхтавацца да заняткаў лепш.

Недахонам з'яўляецца і тое, што з боку комсамольцаў ёсць недысцыплінаванасць, часта наглядаюцца сказненні **(Гельфанд, Варонін і інш.),** а таксама пропускі **(Талудзь),** на што трэба звярнуць увагу комсамольскай арганізацыі.

Зараз мы прыступаем да распрацоўкі Сталінскай Канстытуцыі. Трэба снадзявацца, што актыўнасць комсамольцаў будзе яшчэ лепшай.

ГАЛІОНКА.

Адказ адшчапенцам

31 снежня 1936 года навуковыя работнікі БДУ заслухалі інфармацыю дацэнта **Сагаловіча** аб быўшых акадэміках **Іпацьеве і Чычыбабіне,** якія адмовіліся вярнуцца ў СССР.

Поўныя абурэння гэтым здраднікім паступкам выступалі навуковыя работнікі БДУ, прафесар Годнаў, дацэнт Пелеп, Зубковіч, Мацісава і іншыя. На здраднікі паступак двух адшчапенцаў, якія сталі халопамі капіталістаў, навуковыя работнікі БДУ рашылі адказаць яшчэ большым разгортваннем навукова-даследчай работы, для ўзмацнення нашай социялістычнай радзімы, якая дае неабмежаваныя магчымасці для творчасці ва ўсіх галінах навукі і культуры.

І. НЕКРАШЭВІЧ.

Хроніка

У часе зімовых канікул прафком БДУ пасылае 50 студэнтаў выдатнікаў вучобы ў дамы адпачынку.

***

23 студзеня гэтага года будзе праведзен агульна-універсітэцкі вечар па падвядзенню вынікаў першага навучальнага паугоддзя і прэміраванне выдатнікаў і ўдарнікаў вучобы.

***

Арганізуецца экскурсія 15 лепшых выдатнікаў у Маскву ў часе зімовых канікул. Студэнты наведаюць музей Леніна, гістарычны музей, музей Рэволюцыі, Вялікі акадэмічны тэатр, Траццякоўскую галярэю, метро і інш.

ШЫРЭЙ РАЗГОРНЕМ СОЦСПАБОРНІЦТВА ЗА АТРЫМАННЕ ПЕРАХОДНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГУ

Гістарычны факультэт выходзіць з прарыва

Пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб арганізацыі гістарычных факультэтаў у сістэме універсітэтаў ускладае вельмі вялікую і адказную задачу і на наш універсітэт

Наш гістарычны факультэт, як і гістарычныя факультэты іншых універсітэтаў, яшчэ вельмі малады — існуе ўсяго толькі трэці год. Асноўная труднасць, якая тармозіць ажыццяўленне адказнай задачы па падрыхтоўцы кадраў заключаецца ў адсутнасці прафесарска-выкладчыцкага персаналу.

Па асноўных вядучых дысцыплінах — гісторыі народаў СССР, гісторыі новага часу, а раней і па гісторыі каланіяльных і замежных краін — мы не мелі ні аднаго штатнага прафесара ці хоць-бы дацэнта.

У мэтах забеспячэння выканання вучэбнага плана дэканат гістфака заключыў рад дагавораў з прафесарамі і дацэнтамі ленінградскага універсітэта на праглядзенню курса лекцый па ўказаных дысцыплінах. Але з усіх гэтых асоб, толькі адзін выкладчык выконвае дагавор — гэта дацэнт па гісторыі народаў СССР **т. Маўродзін.** Астатнія, як напрыклад, дацэнт па гісторыі народаў СССР Марозаў і праф. Молак адмовіліся чытаць лекцыі ў першым паўгоддзі, чым яшчэ больш пагоршылі становішча факультэта, і асабліва 3-га курса. У выніку — студэнты якога на працягу двух месяцаў займаліся толькі вывучэннем моў.

У выніку ўсяго гэтага ў студэнтаў склаліся нездаровыя настроі, пачасціліся выпадкі ненаведвання заняткаў, спазненні з боку некаторых студэнтаў і інш. Найбольш злоснымі парушальнікамі дысцыпліны з'яўляліся наступныя студэнты: **Малюкевіч, Рыбакоў, Файн, Герасімаў** і інш.

У мэтах выканання вучэбнага плана, дэканат гістарычнага факультэта рашыў ліквідаваць дагаворы, заключаныя з навуковымі работнікамі ленінградскага універсітэта, за выключэннем дагавора з дацэнтам Маўродзіным, і заключыць рад дагавораў з навуковымі работнікамі Масквы.

Цяпер намі заключаны дагаворы з наступнымі навуковымі работнікамі маскоўскіх вышэйшых навучальных устаноў: з прафесарам Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта **Базілевічам** — для чытання лекцый па гісторыі народаў СССР на першым курсе, з прафесарам **Смірновым**— па гісторыі каланіяльных і залежных краін, з дацэнтам **Седовым** — па гісторыі народаў СССР (XIX стагоддзе), з дацэнтам **Когаут** — па гісторыі новага часу.

Дацэнт Седоў ужо прачытаў 28 лекцыйных гадзін студэнтам II курса, дацэнт Когаут прачытаў частку лекцый па новай гісторыі для студэнтаў III курса. 12 студзеня прыехаў прафесар Смірноў, які чытае лекцыі для студэнтаў II і III курсаў разам. 20 студзеня прыедзе праф. Базілевіч.

Ёсць усе падставы думаць, што ўсе гэтыя таварышы свае абавязацельствы, узятыя па дагавору, **не парушаць.** І вучэбны план будзе выкананы.

Але ўжо зараз неабходна заняцца пытаннем падбору пастаянных навуковых кадраў. Дэканат гістарычнага факультэта намячае павесці перагаворы з радам аспірантаў, якія ў гэтым годзе заканчваюць аспірантуру пры Маскоўскім і Ленінградскім універсітэтах для запрашэння іх на пастаянную работу ў наш універсітэт. Думаю, што нам гэтага ўдаспа дабіцца. Дэканат разам з рэктарыятам паставіў пытанне перад ЦК ВКП(б)Б аб падборы навуковых кадраў для нашага універсітэта

У бліжэйшыя дні пачынаюцца экзамены па раду прадметаў. Неабходна мабілізаваць усю ўвагу студэнтаў на лепшую падрыхтоўку да здачы экзаменаў. Таксама неабходна пакончыць з прагуламі і спазненнямі па заняткі. Гэта можна зрабіць пры ўмове, калі усе студэнты сам павядуць барацьбу з гэтымі нездаровымі з'явішчамі.

1937 год зробім узорным у нашай вучобе. Гістарычны факультэт павінен быць і будзе вядучым факультэтам у нашым універсітэце.

Дацэнт ЧЫМБУРГ.
Дэкан гістарычнага факультэта БДУ.

ЛЕПШ АРГАНІЗАВАЦЬ ВУЧЭБНЫ ПРАЦЭС

Заканчваецца першае паўгоддзе і частка студэнтаў ужо здала залікі па некаторых дысцыплінах. Нягледзячы на павышаныя запатрабаванні да студэнтаў з боку прафесароў вышкі здачы паказваюць, што студэнты ўзятыя ў соцдагаворах збавязкі выконваюць добрасумленна. Аб гэтым гаворыць наступны факт: з 63 зданых прадмета-чалавек, 48 адзнак атрымалі «выдатна» і толькі 17 — «пасрэдна».

Але разам з тым у педпрацэсе біялагічнага факультэта ёсць і рад недахопаў, якія ставяць пад пагрозу зрыву выкананне навучальнага плана: на 4-м курсе ў групе заолагаў неабходна чытаць курс эмбрыялогіі і біяметрыі, але да гэтага часу гэтыя прадметы няма каму чытаць. Аднак, гэта нікольскі не турбуе дэкана факультэта т. Зубковіча.

У той час, калі частка вучэбнага памяшкання біякорпуса выкарыстоўваецца пад жыллоплошчу, IV курс студэнтаў адбывае курс вялікага практыкума ў маленькім пакоі — лабаранцкай.

Зусім недапушчальнае з'явішча, калі 4-ты курс біяхімікаў (выпускны) па вучэбнаму плану павінен праслухаць за другое паўгоддзе і здаць да 1 мая 7 курсаў, у сярэднім па 100—120 гадзін кожны. Цікава, калі-ж гэтыя выпускнікі будуць рыхтавацца да дзяржаўных экзаменаў? Гэты-ж курс мае толькі адзін рабочы дзень, у той час, як у пастанове СНК СССР і ЦК ВКП(б) аб вышэйшай школе ясна сказана, што выпускныя курсы павінны мець два рабочых дні ў тыдні.

Біялагічны факультэт неабходна папоўніць прафесарска-выкладчыцкім персаналам і лепш наладзіць педагагічны працэс.

Сталінская Канстытуцыя, прынятая Надзвычайным VIII Усесаюзным З'ездам Саветаў, якая дае права па асвету грамадзянам нашай краіны, яшчэ больш натхняе студэнтаў лепш вучыцца і дэканат павінен стварыць неабходныя ўмовы для паспяховай вучобы.

П. ПЯТРОВІЧ.

Дадзім краіне 150 тысяч лётчыкаў

На заклік менжынцаў

Адозва рабочых авіязавода імя Менжынскага аб падрыхтоўцы 150 тысяч пілотаў, знайшла жывы водгук сярод студэнтаў універсітэта. Комсамольцы і ўся моладзь універсітэта на курсавых адкрытых комсамольскіх сходах абмеркавалі гэту адозву і тут-жа прыступілі да яе рэалізацыі.

84 чалавека запісалася ў школу пілотаў без адрыву ад вучобы. 24 чалавека запісаліся ў планерную школу 1 ступені, 40 чалавек у групу дэсантных парашутыстаў.

Цяпер працуе камісія па адбору ў гэтыя школы; 7 чалавек ужо адабрана камісіяй у школу пілотаў і яны прыступілі да заняткаў. Гэта таварыш **Казлова, Навысоцкі, Саніковіч, Ананіч, Міранцоў.**

Укамплектавана планерная школа 1 ступені, у якой займаецца 14 чалавек. Вядзецца адбор у планерную школу II-й ступені. Праводзіцца медадбор і пачаліся праграмныя заняткі парашутыстаў. Прыжкі з самалета з парашутам будуць праведзены ў студзені 1937 года.

100 студэнтаў, пераважна комсамольскі актыў, ужо маюць па некалькі прыжкоў з парашутнай вышкі. З 1 студзеня прыжкі з вышкі будуць праводзіцца два разы ў тыдзень. Кожны студэнт зможа прыгнуць з парашутнай вышкі.

БУЯКОЎ.

У лік 150 тысяч

З вялікім натхненнем сустрэла комсамольская арганізацыя гістфака прапанову менжынцаў — даць краіне 150 тысяч лётчыкаў.

На адкрытых комсамольскіх сходах, якія адбыліся 16 снежня 1936 года, на сіх курсах зачытана і абмеркавана адозва менжынцаў.

На комсамольскім сходзе III курса тав. **Шаўцоў** сказаў:

— Я даўно **маю жаданне** стаць лётчыкам і прашу мяне першым запісаць у лік кандыдатаў для паступлення ў школу.

Выдатнік вучобы, комсорг курса тав. **Пятровіч** бярэ абавязак закончыць школу пілотаў таксама на выдатна.

— Я прайшоў камісію ў лётную школу,—кажа **т. Новікаў,**—і да гэтага часу не мог рашыцца ісці ў школу ці не. Зараз цвёрда заяўляю: у адказ на заклік менжынцаў у гонар Сталінскай Канстытуцыі, я буду на выдатна асвойваць нашу стальную крылатую птушку, каб біць фашыстаў без промаху.

Выступаючыя на сходах комсамольцы і несаюзная моладзь таварышы: Кузнецоў, Фішалевіч, Багданава, Бернардава і іншыя прасілі запісаць іх кандыдатамі ў летную школу. Тут-жа на сходах 25 чалавек заявілі—мы будзем выконваць слова таварыша Косарэва, сказаныя ім на X з'ездзе ВЛКСМ, «мы павінны стаць пакаленнем крылатых людзей».

БАГАЛЮБАЎ.

РЭГУЛІРУЮЦЬ ПЯЦЕРК

Дацэнты **Шапіро і Сагаловіч** замест правільнай ацэнкі і ведаў студэнтаў займаюцца выкананнем нейкай «развёрсткі» пяцёрак.

Так, на **IV курсе хімфака** пасля здачы экзамена па рэнтгенаграфіі **т. Шапіро** сказаў студэнтам:

— У вас многія адказвалі на выдатна, але я не магу паставіць столькі выдатных адзнак. Гэта будзе вельмі вялікі процант... У сілу такой вескай прычыны ён паставіў па двух групах толькі 5 адзнак «выдатна».

Такі-ж выпадак быў і з дацэнтам **Сагаловічам.** Пасля экзамена па матэматыцы на **III курсе хімфака** ён заявіў:

— Усе вы адказвалі добра, але больш 5 «выдатна» я не магу вам паставіць.

Пасля здачы экзамена прайшло ужо 2 тыдні, а адзнакі т. Сагаловіч да гэтага часу не выставіў, не глядзячы на неаднаразовыя напамінкі як студэнтаў, так і **дэканата.**

Ясна, што такое рэгуляванне адзнак з'яўляецца няправільным і вядзе да штучнага паніжэння паспяховасці студэнтаў. Нікуды не варта і цяганіна з выстаўленнем адзнак на працягу некалькіх тыдняў.

Р. ШЫФРЫНА.

АДВАЮЕМ ЧЫРВОНЫ СЦЯГ БДУ

Фізіка-матэматычны факультэт БДУ, у здпаведнасці з пастановай ЦК ВКП(б) і СНК СССР, якая была прынята ў чэрвені 1936 года дабіўся значных поспехаў у перабудове сваёй работы.

Палепшылася падрыхтоўка студэнтаў, што дало нам у бягучым годзе магчымасць павысіць навуковы ўзровень чытаемых курсаў і больш шырока разгарнуць работу студэнцкіх навуковых гурткоў.

У бягучым навучальным годзе ўпершыню ў гісторыі БДУ чытаюцца новыя спецыяльныя курсы, вельмі важныя для культуры будучага фізіка і матэматыка, як напрыклад праектыўная геаметрыя, агульны і спецыяльны курс аналітычных функцый, спецыяльны курс тэорыі функный сапраўднага зменнага, прыкладны аналіз, спецыяльны курс вышэйшай алгебры, некалькі факультэтыўных курсаў, курс рэнтгенаграфіі і іншыя.

Упершыню ў гэтым навучальным годзе будзе праведзен для студэнтаў IV курса вытворчы практыкум, аднэй з задач якога будзе прымяненне здабытых тэарэтычных ведаў да канкрэтных задач нашай соцыялістычнай вытворчасці.

Заканчваецца абсталяванне вельмі важнай для нас рэнтгенаграфічнай лабараторыі, устапаўліваецца у спецыяльным пакоі машына Лінда, якая да гэтага часу не выкарыстоўвалася. Закуплена на 70 тысяч рублёў розных дэманстрацыйных фізічных прылад, закуплены некаторыя дэманстрацыйныя прылады па механіцы і матэматыцы.

Маецца значны зрух у рабоце навуковых навукова-даследчых студэнцкіх гурткоў. Упершыню акуратна працуе навуковы гурток па матэматыцы студэнтаў 1 курса, які ахапляе 12 студэнтаў і па якім ужо заслухана 4 даклады студэнтаў 1 курса па вельмі цікавых матэматычных пытаннях. Працуе гурток па вывучэнню тэорыі ўпругасці, на значным тэарэтычным узроўні працуе навуковы гурток па тэарэтычнай фізіцы, гурток па матэматыцы і фізіцы студэнтаў IV курса. Усяго навукова-даследчымі гуркамі ахоплена 42 студэнты.

Мы прыдаем гэтай рабоце вялікае значэнне і не сумняваемся ў тым, што ў выніку работы гэтых гурткоў нашы студэпты дадуць арыгінальныя работы, якія ўвойдуць у фонд квітнеючай совецкай навукі.

У нас цяпер надведзена моцная база для разгортвання навукова-даследчай работы сярод нашых навуковых работнікаў. Амаль усе навуковыя работнікі працуюць цяпер над асобнымі прыкладнымі тэарэтычнымі праолемамі, і мы не сумняваемся у тым, што к канцу вучэбнага года будзем мець каштоўную навуковую прадукцыю.

У вельмі спрыяючых умовах праходзіць навуковае выхаванне нашых маладых навуковых работнікаў. Снежань 1936 года з'явіўся фактычна дысертацыйнай сесіяй нашага БДУ: 3 навуковыя работнікі БДУ тт. Лукомская, Мельпік і Шапіра паспяхова абаранілі кандыдацкую дысертацыю.

Значна палепшылася ў бягучым годзе работа яўрэйскай секцыі, дзе работа да апошняга года праходзіла не заўсёды на дастатковым тэарэтычным узроўні.

Праўда, мы абслугоўваем поўнасцю на яўрэйскай мове толькі першыя два курсы яўсекцыі, але-ж не на дастатковым тэарэтычным ўзроўні. У далейшым работа яўсекцыі будзе разгортвацца і паляпшацца. Гэта адзін з паказчыкаў дасягненняў ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі.

Было-б недастойнай балбатнёй сказаць, што ў нас ужо ўсё добра, што ўжо выканана пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР аб вышэйшай школе. Да гэтага яшчэ далёка. У нас не зусім добра пастаўлена выхаваўчая работа з усімі студэнтамі і з студэнцкім актывам, няма дастатковага ліку высококваліфікаваных прафесароў па фізіцы, дастатковай ініцыятывы, арганізаванасці і т. д.

Аднак трэба падкрэсліць, што дасягнутыя намі над непасрэдным кіраўніцтвам і пры дапамозе партарганізацыі поспехі—наладжанасць вучэбнага працэса, узняцце палітычнай актыўнасці навуковых работнікаў, рэальныя зрухі ў навукова-даследчай рабоце студэнтаў, значны рост маладых навуковых работнікаў, павышэнне дысцыпліны на факультэце і інш. даюць нам магчымасць яшчэ больш павысіць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў вялікай соцыялістычнай радзімы.

А. В. ГЕЛЬФАНД.
Дэкан фізмата БДУ.

Менск, друкарня «Звязды». Тыраж 1000. Гарліт № 84. Адказны рэдактар С. ОДЗІНЕЦ.